Рагачова Л.М., *дацэнт*

# ВЫХАВАЎЧЫ ІДЭАЛ У ПЕДАГАГІЧНЫХ ПОГЛЯДАХ А.Я. БАГДАНОВІЧА

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Не будзе перабольшаннем сказаць, што з канца 80-х гадоў для айчыннай педагагічнай навукі адным з краевугольных

камянёў на шляху яе развіцця паўстала пытанне аб ідэалах выхавання. Вастрыня гэтай праблемы аб'ектыўна звязана з крытычным пераасэнсаваннем і пераацэнкай існаваўшых раней афіцыйна дэклараваных арыенціраў у выхаванні і жаданнем як мага хутчэй вярнуцца ў рэчышча агульначалавечых выхаваўчых каштоўнасцей.

У гэтых супярэчлівых абставінах неабходна звярнуць увагу дзяржаўных, грамадскіх, педагагічных устаноў на той факт, што размова аб агульначалавечых каштоўнасцях без сувязі з нацыянальнай традыцыяй, з асаблівасцямі народнай выхаваўчай практыкі беспрадметна. «Без нацыянальнасці няма чалавека. Усе касмапалітычныя ідэалы - пакуль мёртвая схема, умоўная фікцыя, а не вывады з жыцця, і таму не могуць пусціць карані ў рэчаіснасці»,- так пісаў яшчэ ў пачатку XX ст. актыўны ўдзельнік грамадскага руху на Беларусі Ф.А.Кудрынскі.

Гэтую ж ідэю актыўна падтрымліваў і праводзіў у жыццё адзін з вядомых дзеячаў нацыянальна-культурнага адраджэння Беларусі канца XIX - пачатку XX ст. А.Я.Багдановіч. Ён увайшоў у гісторыю айчыннай культуры як прагрэсіўны грамадскі дзеяч, фальклярыст, этнограф і, зразумела, як выдатны педагог, які выхаваў знакамітага паэта Беларусі М.Багдановіча.

А.Я.Багдановіч прытрымліваўся думкі аб адраджэнні Беларусі праз развіццё актыўных творчых сіл самога народа, аснову якога ён бачыў у абуджэнні нацыянальнай свядомасці беларусаў. Менавіта таму ў пошуках аптымальных шляхоў дасягнення гэтай мэты педагог, следам за К.Д.Ушынскім, звяртаецца да прынцыпу народнасці ў выхаванні падрастаючага пакалення. Ён падкрэслівае, што на працягу доўгіх часоў кожны народ праз успрыманне і перапрацоўку культурнай спадчыны сусветнага супольніцтва выпрацоўвае для сябе аптымальную сістэму выхавання моладзі, стварае выхаваўчы ідэал, які адпавядае псіхічнаму складу нацыі, яе традыцыйным уяўленням аб дасканалай асобе. Гэты па сваёй сутнасці народны ідэал з'яўляецца ядром педагагічнай культуры этнасу



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

і перадаецца новым пакаленням шляхам традыцыйнага выхавання. Але афіцыйная сістэма адукацыі, існаваўшая ў Беларусі, была далёкай ад гэтай народнай спадчыны. Дзяржаўнае выхаванне будавалася на схаластычных прыёмах, дагматызме, адрыве ведаў ад навакольнай рэчаіснасці, што, на думку Багдановіча, парушала гармонію чалавека і яго асяроддзя, разбурала цэласнасць усёй сістэмы, фарміруючай асобу, і, такім чынам, зніжала творчы патэнцыял народа.

Абгрунтоўваючы дзейснасць народнага выхаваўчага ідэалу, Багдановіч падкрэсліваў яго дынамізм. Традыцыйная педагагічная культура народа, яго ўяўленні аб дасканалай асобе, лічыў ён, з'яўляюцца не чымсьці застылым, аджыўшым, а выступаюць як актыўная стваральная сіла, якая нясе ў сабе не толькі сучасны, але і прагнастычны змест і адлюстроўвае пераемнасць пакаленняў, раскрывае ўнутраную духоўную сувязь сучаснага і будучага народа, выяўляе тэндэнцыі яго развіцця.

Народны ідэал выхавання ўвасабляе ў сабе ўсё багацце гістарычнай спадчыны этнасу, яго адметны менталітэт. Таму важнай умовай ажыццяўлення выхавання Багдановіч лічыў працэс прыроднага засваення моладдзю духоўных каштоўнасцей з ранняга дзяцінства. Найбольш эфектыўным шляхам, на яго думку, з'яўлялася паступовае, так званае ўрастанне новага пакалення ў жыццё дарослых, успрыманне іх жыццёвых і духоўных прыярытэтаў у працэсе жыццядзейнасці. Таму ён прапаноўваў з маленства знаёміць дзіця з багатай народнай культурай: песнямі, казкамі, паданнямі, прымаўкамі. Іх змест заўсёды напоўнены не толькі эстэтычнай прыгажосцю, але і высокай чалавечай маральнасцю, гуманізмам. Такім чынам, будавалася асаблівае духоўнае поле, якое і станавілася прыродным асяроддзем выхавання.

Жыццяздольнасць народнага выхаваўчага ідэалу Багдановіч бачыў і ў тым, што такі ідэал не існуе па за працоўнай дзейнасцю чалавека. Праца - гэта перш за ўсё сфера творчага самавыяўлення асобы. Менавіта таму народны выхаваўчы ідэал замацоўваў у беларусаў паважлівыя адносіны да працоўнай дзейнасці, разглядаў яе як меру годнасці чалавека, меру яго сацыяльнай сталасці, вызначальную якасць асобы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Падкрэсліваючы багацце зместу і жыццёвую сілу народнага выхаваўчага ідэалу, А.Я.Багдановіч заклікаў да больш актыўнага выкарыстання яго ў выхаваўчай практыцы. Ніякая школа не можа замяніць народнае выхаванне. Яго аснову складаюць прырода, працоўная дзейнасць, сям'я, фальклорная спадчына - усё, што ўваходзіць у цэласную гістарычную карціну жыцця народа. Уважлівыя адносіны да гэтай скарбніцы, гарманічнае ўключэнне яе ў працэс выхавання падрастаючага пакалення дазволяць, па разуменню А.Я.Багдановіча, стварыць найбольш спрыяльныя ўмовы для развіцця беларускага народа.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ